# Тут агранюююць талент у прафесіяналізм

***Якія новаўвядзенні рыхтуе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў для абітурыентаў сёлета і чым будзе іх здзіўляць***




Калаж Віктара Калініна. Фота Лізаветы Голад.

Уступная кампанія гэтага года ўжо пачалася і набірае абароты. У выпускнікоў школ застаецца не так шмат часу, каб вызначыцца з выбарам, які ў далейшым абазначыць іх жыццё ў прафесіі, ды і не толькі. Вядучая творчая ВНУ краіны чакае маладых людзей, якія хочуць развівацца і стаць спецыялістамі ў галіне мастацтва, музыкі, народнай культуры і традыцый. Пра тое, якой бачаць уступную кампанію 2026 года кіраўніцтва і прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта, якіх абітурыентаў чакаюць і што цікавага для іх рыхтуюць, расказвае рэктар БДУКМ Наталля Карчэўская.

Заканчэнне на стар. 3 ▸

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

НОВЫ ПРАЕКТ «ЛіМа» — «ІМЯ Ў ВЕЧНАСЦІ» З ІГАРАМ МАРЗАЛЮКОМ 5



СВЕТЛАЯ НАДЗЕЯ НАТАНА ВОРАНАВА 12



ISSN 0024-4686

# Тут аграняюць талент у прафесіяналізм

## З улікам запатрабаванасці

Сёння ва Універсітэце культуры і мастацтваў спецыялістаў рыхтуюць на 4 профільных факультэтах: культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, музычнага і харэаграфічнага мастацтва, мастацкай культуры, інфармацыйна-дакументных камунікацый. Як сказала рэктар універсітэта Наталля Карчэўская, ёсць у складзе ўніверсітэта і Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, 25 спецыяльных і агульнаўніверсітэцкіх кафедраў.

Па словах кіраўніка ВНУ, ніякіх прыкметных змен у ход паступлення ў гэтым годзе ва ўніверсітэце на прадбачыцца. Прыём ажыццяўляецца па 15 спецыяльнасцях.

– Мы плануем павялічыць набор на іх на 44 месцы, – дзеліцца планамі рэктар. – Прычым, як бюджэтных, так і платных. Але гэта пакуль толькі наш праект. Лічбы прыёму зацвярджае Міністэрства адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам культуры. Падставай служаць тыя заяўкі, якія ёсць у аўтаматызаванай сістэме замовы кадраў. Пры гэтым аналізуецца пяцігадовая, як мінімум, конкурсная сітуацыя. У першую чаргу ўлічваецца запатрабаванасць спецыялістаў ва ўстановах культуры, адукацыі і ў цэлым сацыякультурнай сферы нашай краіны. Плюс восем месцаў чакаем на спецыяльнасць «Бібліятэчная і інфармацыйная дзейнасць». На аднаго такога выпускніка нам паступае каля васьмі заявак ад працадаўцаў.

Азнаёміла Наталля Уладзіміраўна і са статыстыкай па выніках мінулай уступнай кампаніі, лічбы якой гавораць аб тым, што ў нашай краіне шмат творчай моладзі, гатовай дзяліцца сваім талентам з людзьмі. Конкурс 3,8 чалавека на месца ўтварыўся на спецыяльнасці «Акцёрскае мастацтва (прафілізацыя "Мастацтва мюзікла")». На спецыяльнасць «Рэжысура тэатра (прафілізацыя "Рэжысура тэатральных праектаў")» конкурс склаў 2,5 чалавека на месца. «Культуралогія» (прафілізацыя "Сіналогія")» сабрала каля 3 чалавек на месца, каля 2 чалавек прэтэндавалі на месца па спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва». Таксама папулярнасцю ў абітурыентаў карысталіся спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства», «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (прафілізацыя "Лічбавізацыя")» і «Музычнае мастацтва эстрады».




– Сёння ў нашым універсітэце, як і ва ўсіх сучасных ВНУ краіны, навучанне грунтуецца на спалучэнні класічных акадэмічных традыцый і актуальных прафесійных стандартаў. Акрамя ўласна мастацтва мы навучаем студэнтаў менеджменту, маркетынгу, праву, замежным мовам, *IT* і псіхалогіі, – паведаміла Наталля Карчэўская.

## Новае жыццё звыклых спецыяльнасцей

Час не стаіць на месцы, ён патрабуе абнаўленняў, таму ва ўніверсітэце прыўносяць свежы струмень ў профільныя спецыяльнасці, уводзячы туды новыя прафілізацыі.

Так, сёлета ў БДУКМ з'явіцца напрамак «Класічны і народнасцэнічны танец». Новая прафілізацыя будзе і на спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва». Але з агаворкай.

– Паступаць на яе змогуць толькі выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (каледжаў культуры і мастацтваў, а таксама Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа) для атрымання адукацыі ў завочнай скарочанай форме навучання, – тлумачыць Наталля Уладзіміраўна, і дадае: – Наша ВНУ раз на тры гады праводзіць набор на спецыяльнасць «Камп'ютарная музыка». Спецыяльнасць будзе даступная і ў гэтую прыёмную кампанію – на дзённай форме атрымання адукацыі.

## Калі выбар — асэнсаваны

Наталля Карчэўская падкрэсліла, што ўніверсітэт рыхтуе спецыялістаў для ключавых сацыяльна-культурных устаноў краіны. Выпускнікі БДУКМ працуюць практычна ва ўсіх найбуйнейшых установах рэспублікі – гэта і Нацыянальны мастацкі музей, і Нацыянальная бібліятэка, тэатры і канцэртныя арганізацыі. Таму асаблівая ўвага ў ВНУ надаецца мэтавай форме падрыхтоўкі. Летась на дагаворных умовах у БДУКМ паступілі 29 чалавек. І хоць універсітэт – установа адукацыі творчая, і прадугледжвае здачу экзамену пры любой траекторыі паступлення, але ёсць спецыяльнасць, куды мэтавікі могуць паступіць без уступных выпрабаванняў.

– Напрыклад, на спецыяльнасць «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» залічэнне ў нас праходзіць без конкурсу, бо яна ўваходзіць у пералік найбольш запатрабаваных эканомікай, – сказала рэктар. – Мэтавікам універсітэт гарантуе месцы ў інтэрнаце на ўвесь перыяд навучання, а таксама цесную сувязь з будучым наймальнікам праз усе віды практык.

Аднак, падкрэсліла Наталля Уладзіміраўна, пры паступленні галоўным крытэрыем застаецца якасць ведаў абітурыентаў, якія паступаюць і на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, і па агульным конкурсе. Калі мэтавік падрыхтаваны недастаткова добра, то па прынцыпе справядлівасці перавага будзе аддадзена тым, хто гатовы лепш.

Адной са значных пераваг Універсітэта культуры і мастацтваў рэктар назвала магчымасць атрымаць у яго сценах падвойную кваліфікацыю: у першую чаргу выкладчыка, а ўжо пасля – рэжысёра, мастака або мастацтвазнаўцы. Дзякуючы гэтаму выпускнікі БДУКМ могуць працаваць ва ўстановах і культуры, і адукацыі.

***«Мы плануем павялічыць набор на іх на 44 месцы, — дзеліцца планамі рэктар. — Прычым, як бюджэтных, так і платных. Але гэта пакуль толькі наш праект. Лічбы прыёму зацвярджае Міністэрства адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам культуры. Падставай служаць тыя заяўкі, якія ёсць у аўтаматызаванай сістэме замовы кадраў».***

## Практыка-арыентаванасць і навуковая дзейнасць

– Нашы студэнты не проста атрымліваюць тэарэтычныя веды, – тлумачыць Наталля Карчэўская, – але і з першых дзён інтэгруюцца ў рэальнае прафесійнае асяроддзе. І на працягу ўсяго перыяду навучання яны актыўна не толькі ўдзельнічаюць, але і дапамагаюць арганізоўваць розныя мерапрыемствы – як лакальнага, універсітэцкага, характару, так і маштабныя рэспубліканскія акцыі, фестывалі і дабрачынныя праграмы.

Рэктар ВНУ таксама дадае, што для тых, хто імкнецца да навукі, ва ўніверсітэце ёсць магістратура і аспірантура. Прафесарска-выкладчыцкі склад – больш за 350 чалавек. Каля 50% выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і ганаровыя званні. Акрамя таго, для правядзення лекцый, практычных заняткаў, круглых сталоў, майстар-класаў у БДУКМ запрашаюцца спецыялісты і выкладчыкі з вядучых замежных універсітэтаў для правядзення лекцый, практычных заняткаў, круглых сталоў, майстар-класаў.

**Алена ВІНАГРАДАВА**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**





Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.